**А. А. Кастрыца**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІН «УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА» І «КУЛЬТУРАЛОГІЯ»

Адукацыйны працэс ва ўмовах развіцця сучаснага грамадства з яго поліінфармацыйнай і полікультурнай насычанасцю, значным узроўнем сацыяльнай мабільнасці павінен быць арганізаваны такім чынам, каб студэнт, з'яўляючыся ўсё ж такі суб'ектам, а не аб'ектам працэсу навучання, быў здольны да рэалізацыі сваіх асобасных і прафесійных якасцей у розных відах дзейнасці.

Не выклікае пярэчанняў меркаванне, што для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў дня сённяшняга такія якасці, як гатоўнасць да набыцця новых ведаў, уменне кантраляваць і ацэньваць вынікі сваёй кагнітыўнай дзейнасці, здольнасць да нестандартнага і творчага асэнсавання праблем, ініцыятыўнасць і самастойнасць у прыняцці рашэнняў, асобасная ўключанасць ў працэспавінны быць прыярытэтнымі, паколькі фарміраванне іх прафесійнага аблічча пачынаецца падчас атрымання імі адукацыі.

Сучасныя метады, прыёмы і формы навучання дазваляюць выкладчыкам наладзіць такую сістэму работы, якая максімальна дазваляе сфарміраваць кампетэнцыі, неабходныя спецыялістам з вышэйшай адукацыяй.Звернемся да некаторых метадаў, прыёмаў і форм, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца намі на занятках па культуралогіі і ўводзінах у літуразнаўства.

Метады і формы інфармацыйнай (інфармацыйна-камунікацыйнай) тэхналогіі і тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве забяспечваюць высокую ступень індывідуалізацыі навучання і адначасова арганізацыю навучання як калектыўнага працэсу з асобаснай адказнасцю кожнага члена групы за сваю якасць работы і за поспехі астатніх. Так, на занятках і падчас самастойнай кіруемай работы па дысцыплінах «Уводзіны ў літаратуразнаўства» і «Культуралогія» студэнтам прапануецца ў якасці як індывідуальнага, так і калектыўнага відау дзейнасці *падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый.*

Праграма, у якой выконваюцца прэзентацыі, студэнтамі выбіраецца адпаведнасці з мэтамі, якія перад імі ставіць выкладчык (стварыць праект, праілюстраваць інфармацыю, знайсці нестандартнае рашэнне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падачы матэрыялу і да т.п.), спосабамі афішыравання матэрыялу (прэзентацыя падчас вучэбных заняткаў, прадстаўленне ў інтэрнэт-прасторы і інш), часавымі тэрмінамі выканання задання (у межах 1–2 акадэмічных гадзін або некалькіх дзён, тыдняў і г.д.) і ступенню самастойнасці (калектыўнасці) яго падрыхтоўкі.

Адзначым, што публічнае прадстаўленне прэзентацый («Мастацкія вобразы», «Аўтар і чытач мастацкага твора: два бакі аднаго медаля», «Навука араба-мусульманскага свету», «Тытаны эпохі Адраджэння», «Архітэктура Індыі» і інш.) на занятках адбываецца рознымі шляхамі: у выглядзе інтэрактыўнай лекцыі, гульні, канферэнцыі і інш.

Цікавым відам дзейнасці для студэнтаў з'яўляецца *стварэнне аўтарскіх (распрацаваных паводле ўласнага сцэнарыю) відэафільмаў, мультфільмаў, буктрэйлераў, тэматычных камп'ютарных гульняў* (напрыклад, «Таямніцы Авіцэны», «Тэатр Старажытнай Грэцыі», «Сон Калабка напярэдадні прыгод» (для адпрацоўкі паняцця псіхалагізму ў творы), «Мой сябра – дэтэктыў» і інш.).Заданні падобнага роду носяць адначасова крэатыўны і кагнітыўны характар і арыентаваны на вялікую ступень самастойнасці выканання.

Падчас чытання лекцый выкладчыкам выкарыстанне прэзентацый ілюстрацыйнага або праверачнага тыпу, відэматэрыялаў, магчыма, анімацыі ў сукупнасці з раздатачным матэрыялам, дзе прапушчана інфармацыя, якая абавязкова прадстаўлена на слайдах або ў відэароліках, дае магчымасць актывізацыі ўвагі студэнтаў да вучэбнага матэрыялу, прапануемага лектарам, павышэння цікаўнасці да тэмы заняткаў. Да таго ж, навучанне такога тыпу з'яўляецца больш эмацыянальна і эстэтычна насычаным, што таксама спрые лепшаму запамінанню інфармацыі.

Адзначым, што стварэнне і афішыраванне прэзентацый, камп'ютарных гульняў, відэаролікаў, буктрэйлераў вельмі карысная для педагога, і для студэнта, паколькі, дзякуючы ім, пашыраюцца магчымасці цікавага і запамінальнага прадстаўлення вучэбнай інфармацыі, канцэнтруецца ўвага і адбываецца арыентацыя іх на самастойнасць і творчы падыход да навучання, ствараецца аснова для рэалізацыі патэнцыяльных магчымасцей ў розных галінах ведаў і дзейнасці.

Даволі ўдзячнымі метадамі падчас заняткаў па культуралогіі і ўводзінах у літаратуразнаўства з'яўляюцца *метады групавога рашэння творчых задач* (напрыклад, напісанне міні-тэксту, дзе пейзаж стварае пэўную эмацыянальную атмасферу і выступае формай псіхалагізму;складанне «хіт-парадаў» літаратурных герояў;стварэнне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прэзентацыйных буклетаў, слоўніка культуралагічных тэрмінаў і да т.п.), сярод якіх можна выдзеліць *метад 6-6, метад Дэльфі, мазгавы штурм і метад развіцця супрацоўніцтв*а.

У дадзеным выпадку студэнты ў межах маленькіх груп шукаюць рашэнне адной і той жа творчай задачы з наступнай яеабаронайі рэдагаваннем пры неабходнасці. Вялікая колькасць варыянтаў рашэння і іх разнастайнасць ілюструюць не толькі здольнасць да нестандартнага і творчага асэнсавання праблем, але і паказваюць маладым людзям, што «аднабаковасць» у прыняцці рашэнняў збядняе магчымасці як асобаснага росту, так і прафесійнага развіцця, а работа ў камандзе дае магчымасці для прыняцца больш выверaных рашэнняў.

Таксама сярод інтэрактыўных метадаў навучання варта адзначыць *правільныя і няправільныя сцверджанні.* Выкладчык прапануе студэнтам на пачатку заняткаў некалькі сцверджанняў і просіць вызначыць, якія з іхз’яўляюцца правільнымі, а якія – памылковымі (абгрунтаванне выбару з’яўляецца абавязковым).

Напрыклад:

1) гукапіс-ужываецца толькі ў вершаваных тэкстах;

2) найбольш распаўсюджанай формай гукапісу з'яўляюцца паэтычныя паўторы;

3) гукапіс уяўляе пэўную эстэтычную гульню;

4) гукавая гама не павінна паўтараць рэальныя гукі.

Пасля студэнтам прапануецца максімальна поўная інфармацыя па разглядаемых пытаннях для паглыблення ведаў,потым выкладчык звяртаеццада студэнтаў з просьбай – выбраць правільныя сцверджанні з шэрагу прадстаўленых выказванняў.

Відавочна, што такім чынам канцэнтруецца максімальная ўвага навучэнцаў на матэрыяле і дасягаецца высокая ступень запамінання прапанаванай інфармацыі. Гэты метад можа быць запатрабаваны як на практычных, так і на лекцыйных занятках, калі апошнія носяць ітэрактыўны характар.

У некаторых выпадках у вучэбным працэсе даволі запатрабаванай з’яўляецца *тэхналогія інтэлект-карт*. Так, яе выкарыстанне дапамагае ўдала структураваць любы цяжкі матэрыял, ствараць планы артыкулаў, ствараць праекты.

Паколькі ў аснове інтэлект-карт ляжыць тэорыя радыянтнага мыслення, прапанаваная Т. Б’юзенам [1], заснаваная на стварэнні ў свядомасці чалавека сістэмы асацыятыўных паняццяў, то сутнасць тэхналогіі заключаецца ў развіцці ў здольнасці ўспрымаць,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

перапрацоўваць і засвойваць розныя віды інфармацыі ў разнастайных малюнкавых, графічных, тэкставых формах.

*Метад паслядоўных асацыяцый (ланцужок асацыяцый)*– вельмі ўдалы варыянтзнаёмства з новым матэрыялам як для студэнтаў, так і для выкладчыка. Студэнты падбіраюць свае асацыяцыі (вербальныя або невербальныя) да пэўнага паняцця (напрыклад, *аўтар, герой, Сярэнявечча*) і фіксуюць іх, пасля агучваюць або ілюструюць і, па магчымасці, тлумачаць, чым выклікана тая ці іншая асацыяцыя (напрыклад, *архітэктура, іезуіты, Балонскі ўніверсітэт, лекцыя, карта Еўропы, рыцарства, нацыянальныя мовы, замак; стваральнік, казачнік, уладальнік, геній, вопытны чалавек, творца, мастак і інш.)*. Рады асацыяцый можна пры жаданні дапоўніць тымі, што ўзніклі ў аднагрупнікаў. Пасля робіцца выбар: у кожным асацыятыўным радзе падкрэсліваецца (абводзіцца, маркіруецца) найбольш значнае, на думку чалавека, які робіць гэты выбар, паняцце, да яго таксама падбіраецца асацыяцыя. Падобныя падборы асацыяцый дапамагаюць ўзнаўляюць у розных формах (напрыклад, вобразных), веды, якія ўжо былі назапашаны папярэдне, а пасля дапаўняць іх новай інфармацыяй і творча перапрацоўваць.

У сувязі з гэтым варта прыгадацьмеркаванне доктара педагагічных навук А. І. Савянкова, «кожная новая інфармацыя, ператварыўшыся ў асабісты набытак чалавека – веды, поўнасцю іх рэканструюе, робіць зусім іншымі. Менавіта таму творчы чалавек – чалавек, адкрыты да новага вопыту, здольны засвойваць новыя веды» [2, с.60].

Узаемадзеянне студэнтаў і выкладчыкаў у межах рашэння імі адукацыйных задач можа быць даволі выніковым, калі звярнуцца да такіх сучасных адукацыйных тэхналогій, якія дазваляюць уключыць студэнта ў працэс атрымання ведаў, пазбягаючы пры гэтым іх элементарнага трансліравання, якое не мае каштоўнасці і сэнсу, таму што веды-адкрыцці і веды-разуменні ператвараюцца ў такім выпадкуўсяго толькі ў веды-запамінанні, якія для сучаснага грамадства ўвогуле і адпаведна кіраўніка арганізацыі ў прыватнасці з’яўляюцца занадта прымітыўнымі, паколькі прапануюць яму не актыўнага і смасастойнага ў прыняцці рашэнняў спецыяліста, а інфантыльную асобу, не здольную да прафесійнай дзейнасці ў сучасным свеце штодзённых змен і вынаходніцтваў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Бьюзен, Т. и Б. Супермышление / Т. и Б. Бьюзен. – Мн: ООО «Попурри», 2003. – 304 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2. Савенков, А. И. Содержание и организация исследовательского обучения школьников /А. И. Савенков. –М.: «Сентябрь», 2003. – 204 с.

3. Современные образовательные технологии в вузе: справочник/ автор-составитель канд.ист.наук, доц. О.Н. Хохлова. – Тверь: Твер. гос. ун-т, 2011. – 42 с.